HEINRICH BÖLL STIFTUNG

# У сястрынстве наша сіла

Прамова. Новая Беларусь пачалася для яе з Жаночай рэвалюцыі 2020 і працягваецца сёння. Юлія Міцкевіч ўспамінае натхненне ад прыгожых і яркіх жанчын на маршах і перакананне, што перамагчы магчыма

Шаноўныя каляжанкі ды калегі, партнеры і партнеркі, мае сяброўкі і сябры, якіх я бачу у гэтым залі і якія, я ведаю, глядзяць гэтую цэрымонію на Ютуб, гэта вялікая асалода, гонар і нават прывілея стаяць тут, каб атрымаць Жаночую узнагароду Анны Кляйн разам з цудоўнымі Дар'яй і Ірынай.

Прыемна атрымаць любую прэмію, як прызнанне дасягненняў і вынікаў праведзенай працы. Але атрымаць прэмію за феміністкую дзейнасць - асабліва каштоўна. Не так шмат узнагарод у свеце, на жаль, дастаецца жанчынам. Многае з таго, што мы робім, застаецца па-ранейшаму нябачным ці перастае быць значным з цягам часу.

Ведаеце, на маім працоўным стале ў кватэры стаіць таблічка Full time feminist, якая адлюстроўвае сутнасць мяне як асобы і ўсяго, што я раблю і ў што веру. Як мінімум апошнія 25 год. Быць феміністкай азначае для мяне быць задзейнічанай, неабыякавай, эмпатычнай і спагадлівай. І так было ўвесь час, як я сябе памятаю. Яшчэ ў дзяцінстве ў мяне было абвостранае пачуццё справядлівасці, мне хацелася дапамагаць і падтрымліваць тых, каго на мой погляд несправядліва пацярпелі, і мне за гэта часцяком даставалася ад дарослых. Я нарадзілася і сталела ў савецкі і потым постсавецкі час, дзе ролі для дзяўчынак і жанчын былі даволі вузкія, правы і магчымасці лімітаваныя, а чаканні ад нас часта не супадалі з нашымі жаданнямі. І я адчувала, што з гэтым нешта не так, але не магла выказаць словамі, мне не хапала ведаў і досведу, але я ўсё роўна старалася любую несправядлівасць спыніць і паўплываць на тое, каб яна не здаралася. І гэта галоўная прычына, чаму я прыйшла ў пачатку 2000-х у грамадзянскі актывізм і пачала яго ў ЛГБТК+ ініцыятыве, потым стала журналісткай, потым узначаліла моладзевую сацыял-дэмакратычную арганізацыю, праз час заснавала разам са шведскімі партнёрамі адукацыйны праект. Ва ўсім, што я рабіла і раблю, са мной заўсёды быў фемінізм і фем оптыка як адпраўныя кропкі маёй працы, дзейнасці і ладу жыцця. Сёння займаючы розныя пасады ў розных структурах і арганізацыях, маючы публічную вагу, статус і ўплыў, я стараюся максімальна выкарыстоўваць іх як інструменты для прасоўвання феміністкіх ідэй і каштоўнасцей.

## Без удзелу і лідэрства жанчын няма дэмакратычнай палітыкі

І асабліва моцна гэта выявілася ўва мне і ў маім жыцці падчас пратэстаў. Новая Беларусь пачалася для мяне з Жаночай рэвалюцыі 2020 і працягваецца сёння. Назаўжды ў маім сэрцы і душы застануцца ўспаміны таго натхнення ад прыгожых і яркіх жанчын на нашых маршах і акцыях і веры, што зусім хутка мы зможам пераламаць сітуацыю на сваю карысць і абавязкова пераможам. І я буду працягваць адстойваць і настойваць, што беларускі пратэст 20-га года засноўваўся (свядома ці не) на феміністкіх прынцыпах інклюзіўнасці, размеркаванага лідэрства, гарызантальнасці, разнастайнасці і салідарнага клопату. Мы шмат абмяркоўвалі гэта, калі сядзелі на содніях, і праводзілі там з маёй сяброўкай Ольгай Шпарагай для нашых турэмных сясцёр семінары аб правах жанчын. Тады мне стала найбольш зразумела, што феміністкая асветніцкая праца не заканчваецца ніколі і трэба выкарыстоўваць любую магчымасць і любое асяроддзе яе працягваць. Я атрымала так шмат бясцэннага досведу ад валявых і бясстрашных жанчын, з якімі апынулася побач у тыя дні ў адным замкнёнай на 15 дзён прасторы. І я так ім удзячная, як і ўсім, з кім мне пашчасціла быць разам у грамадзянскім актывізме і асабліва ў палітыцы. Я сапраўды ведаю, як няпроста бывае жанчынам тамака, праз якія дадатковыя бар'еры, перашкоды і складанасці ім прыходзіцца праходзіць, якая колькасць сексізму, ціскі і абясцэньванні прыходзіцца вытрымоўваць. А яшчэ пачуццё адзіноты, сіндрому самазванкі і адсутнасці падтрымкі. Мне ўсё яшчэ часам бывае страшна выказацца, нават маючы вялікі досвед публічнага гаварэння. Аднак я ведаю і памятаю, што без удзелу і лідэрства жанчын няма дэмакратычнай палітыкі - той, якая адпавядае інтарэсам і запытам саміх жанчын і іншых уразлівых груп, а без гэтага няма - сацыяльнай справядлівасці і сапраўднай роўнасці, эканамічнай, палітычнай, культурнай. І мне

ў дапамогу ў складаныя хвіліны - наша феміністкае сястрынства і натхненне ад неверагодных беларусак, якія маё вялікае каханне. Яны працягваюць свой супраціў, і я не стамляюся дзяўбці разам з імі і не схіляюся.

[Hier eingeben]

Таму што ў мяне ёсць мара - жыць у Беларусі, дзе ў тых, хто прымае рашэнні, ёсць палітычная воля да дасягнення гендэрнай роўнасці, без якой немагчыма інклюзіўная дэмакратыя, І як мінімум палова з іх - жанчыны. Інакш гэта як крэсла на трох ножках. Гэта дае мне надзею не толькі для сябе, але і для іншых - асабліва дзяўчынак, такіх як маепляменніцы Ліза і Маша, якім дзесяць і шэсць гадоў, якія таксама жывуць у змушаным выгнанні. Гэта дае мне надзею не толькі для сябе, але і для іншых - асабліва дзяўчынак, такіх як маепляменніцы Ліза і Маша, якім 10 і 6 гадоў, якія таксама жывуць у змушаным выгнанні. Яны -дзеці новага пакалення, у якіх я шмат чаму вучуся, напрыклад, як адстойваць сябе і свае межы, і якіх, я веру чакае лепшая будучыня.

Нашыя лепшыя сябры - права чалавека

Мне падаецца, што сьвет сёньня як ніколі мае патрэбу ў фэмінізме як у ідэалёгіі і стратэгіі дзеяньняў, бачачы як узмацняюцца антыгендэрныя рухі ва ўсёй Эўропе, як дыктатары прыходзяць да ўлады і ўзурпуюць яе ня толькі на сфальсыфікаваных выбарах, але і дэмакратычным шляхам. І першае, што яны робяць - гэта пачынаюць змагацца з гендэрнымі пытаннямі: адмяняюць унутраную палітыку роўнасці і інклюзіўнасці або знешнюю феміністкую палітыку, забараняюць аборты ці закон супраць хатняга гвалту. Гэта ў логіцы аўтакратаў, для якіх сексізм і гамафобія - звычайная практыка, а фемінізм успрымаецца імі як экстрэмізм. Тым мацнейшай павінна быць наша агульная, не толькі сярод феміністак, салідарнасць у захаванні дэмакратычных інстытуцый, іх гуманітарнай асновы, таму што па сутнасці гэта барацьба за павагу нашай чалавечай годнасці.

Я падзяляю гэтую прэмію са сваёй любімай Фемгрупай і маімі дарагімі калежанкамі за арганізацыі АБФ, з усімі беларускімі актывісткамі, якія знаходзяцца ў турме, працягваюць заставацца ўнутры краіны ці жывуць у выгнанні, але не здаюцца. У сястрынстве наша сіла - гэта не проста лозунг ці прыгожыя словы, гэта тое, што нас аб'ядноўвае паміж сабой і з нашымі сёстрамі і сяброўкамі ў розных краінах свету, якія працягваюць 24/7 нашу феміністкую барацьбу за мір без гвалту, дыскрымінацыі, войнаў і канфліктаў. Нашыя галасы - гэта наш выбар, а нашыя лепгыя сябры - права чалавека.

Я прысвячаю гэтую прэмію сваім бабулям і маме, а таксама Машы, з якой сядзела ў турме, і ўсім звычайным жанчынам, у якіх есць шмат талентаў, жаданняў і летуценняў, але з-за стэрэатыпаў і перашкод не было магчымасцей іх ажыццявіць. За правы і магчымасці для такіх жанчын змагалася і нязломная Ганна Кляйн, і памяць аб ёй - таксама натхненне для мяне і мой унутраны рэсурс.

Вялікі дзякуй арганізатарам узнагароды, журы і фонду Генрыха Беля, і ўсім, хто мае дачыненне. Я шчаслівая сення. Жыве Беларусь!